**КІСЯЛЁЎКА** (яна ж Слабодка да 1938 г.) – вёска ў былым Саматэвіцкім сельскім Савеце (да 1994 г.), за 28 км на ПдЗ ад Касцюковіч і чыгуначнай станцыі Камунары на лініі Крычаў – Сураж, 188км ад Магілёва, на рацэ Чарняўка (прыток р. Бесядзь). Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Саматэвічы – Касцюковічы.

Вядома з 18 ст. Пасля 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772) у складзе Расійскай імперыі. У 1777 годзе згадваецца як в. Слабада, у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерніі, і сяльцо – 25 двароў, 188 жыхароў, уладанне памешчыка.

У 19 ст. вядома як цэнтр двух невялікіх маёнткаў у Чэрыкаўскім павеце Магілёўскай губерні. Паводле інвентара 1848 г., маёнтак Кісялёўка, 25 двароў, 150 сялянскіх душ, уладанне памешчыка Абакановіча, які меў 800 дзесяцін зямлі. У сялян было 261 дзесяціна зямлі. Побач размяшчаўся другі маёнтак Кісялёўка, 120 сялянскіх душ, уладанне памешчыка Вандзона, які меў 580 дзесяцін зямлі. У яго сялян было 276 дзесяцін зямлі, кожная сялянская душа была надзелена 4,53 дзесяцінамі. Паводле перапісу 1897 г. у Кісялёўцы 1 (яна ж Слабодка) 54 двары, 470 жыхароў, школа граматы, піцейны дом, у Кісялёўцы 2 (яна ж Слабодка) 39 двароў,413 жыхароў. Побач існавалі фальваркі Кісялёўка 1 (1 двор, 7 жыхароў, вадзяны млын) і Кісялёўка 2 (1 двор, 3 жыхары, вадзяны млын) .

На пачатку XX ст. вёска адносілася да Саматэвіцкага праваслаўнага прыхода Троіцкай царквы. У 1909 г. Кісялёўка-1 на грунтавой дарозе пры р. Чарняўка, 62 двары, 321 жыхар, якім належала 330 дзесяцін зямлі. Побач размяшчалася Кісялёўка-2, 43 двары, 306 жыхароў, якой належала 328 дзесяцін зямлі. На вялікай дарозе размяшчаўся фальварак Кісялёўка-2, 2 двары, 20 жыхароў. У 1909 г. адкрыта земская школа. Пасля рэвалюцыі на базе дарэвалюцыйнай школы была створана працоўная школа 1-й ступені, якая размяшчалася ў былым маёнтку, у 1924 г. у ёй навучаліся 73 вучні. З 20.08.1924 г. у Саматэвіцкім сельсавеце Касцюковіцкага раёна Калінінскай, з 09.06.1927 г. Магілёўскай акругі. Паводле перапісу 1926 г., у вёсцы Кісялёўка- 2 (56 двароў, 340 жыхароў). У 1930 г. вяскоўцы ўступілі ў калгас. У вёсцы працавала кузня, меўся млын. У брацкай магіле ў цэнтры вёскі пахаваны 12 воінаў 269-й стралковай дывізіі 3-й арміі Бранскага фронту, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баі каля вёскі. Вызвалена 29.09.1943 г. Паводле перапісу 1959 г. 364, у 1970 г. 289 жыхароў.У



1986 г. 79 гаспадарак, 194 жыхары, у складзе саўгаса “Саматэвічы”, працаваў магазін. Забудавана пераважна двухбакова, няшчыльна драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. Побач залежы гліны. Радзіма Мікалая Аляксеевіча емляка.



М.А. Мельнікаў

У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС жыхары адселены ў 1994 г. у п. Новыя Саматэвічы. У 2015 годзе была пахавана.